2025

# МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ АДВАКАТА Ў НЕБЯСПЕЦЫ

# БЕЛАРУСЬ



OBSERVATOIRE INTERNATIONAL DES AVOCATS

protect-lawyers.org

*Гэтая брашура была распрацавана Міжнароднай абсерваторыяй для адвакатаў у небяспецы (OIAD) у супрацоўніцтве з Беларускай асацыяцыяй адвакатаў правоў чалавека (БААПЧ).*

Пачынаючы з 2009 года Міжнародны дзень адваката ў небяспецы адзначаецца ва ўсім свеце 24 студзеня. Менавіта ў гэты дзень у 1977 годзе адбыўся «Расстрэл на вуліцы Аточа», калі ў Мадрыдзе на вуліцы Аточа, 55, былі забіты чацвёра нашых калег.

Гэты адмысловы міжнародны дзень праводзіцца, каб прыцягнуць увагу грамадзянскай супольнасці і дзяржаўных органаў да становішча адвакатаў у канкрэтнай краіне, якая выбіраецца кожны год, і распаўсюдзіць інфармацыю аб пагрозах, з якімі адвакаты сутыкаюцца пры ажыццяўленні сваіх прафесійных абавязкаў.

**Раней мы ўжо звярталі ўвагу на тое, што адбываецца ў Турцыі, на Філіпінах, у Гандурасе, Кітаі, Егіпце, Пакістане, Азербайджане, Калумбіі, Афганістане і Іране.** У 2025 годзе Міжнародны дзень адваката ў небяспецы будзе прысвечаны сітуацыі ў Беларусі.

> **Адмаўляць людзям у правах чалавека – значыць выступаць супраць самой іх чалавечнасці.**
> **(Нельсан Мандэла)**



Адвакатура ў Беларусі знаходзіцца пад сур'ёзнай пагрозай з-за сістэматычных рэпрэсій з боку ўладаў. За сваю гатоўнасць абараняць кліентаў адвакаты сутыкаюцца з сур'ёзнымі наступствамі — крымінальным пераследам, турэмнымі зняволеннямі, пазбаўленнем ліцэнзій, дысцыплінарнымі спагнаннямі, ганеннямі, катаваннямі і вымушанай эміграцыяй.

**На наступных старонках вы даведаецеся пра рэаліі працы беларускіх адвакатаў, якія мужна абараняюць асноўныя правы грамадзян Беларусі.**

## ПАЛІТЫЧНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ

У Беларусі ўсталяваны аўтарытарны рэжым на чале з Аляксандрам Лукашэнкам, які ўтрымлівае ўладу з 1994 года. Ён жорстка кантралюе ўсе органы дзяржаўнага кіравання не ў апошнюю чаргу праз слабыя і падкантрольныя яму парламент і суды.

Пасля скандальнага пераабрання Лукашэнкі ў 2020 годзе палітычны ландшафт Беларусі характарызуецца практычна поўнай адсутнасцю плюралізму. Апазіцыйныя партыі знаходзяцца ў маргінальным становішчы, а іх лідары часта трапляюць у турмы або вымушаны з'язджаць за мяжу. Незалежныя медыя жорстка рэпрэсуюцца, а свабода слова падаўляецца абмежавальнымі законамі і цэнзурай. У такіх варунках для падтрымання сваёй улады беларускі ўрад абапіраецца на лаяльныя сілавыя структуры, якія часта ўжываюць гвалт і запалохванне, каб звесці да мінімуму любую форму іншадумства.

Урад узмацніў ціск на адвакатаў, якія спецыялізуюцца на абароне правоў чалавека. Любыя нязгодныя галасы душацца, а пад рэпрэсіі ў першую чаргу трапляюць тыя, хто спрабуе адстаяць фундаментальныя правы, што робіць Беларусь яскравым прыкладам таго, як ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму зневажаецца прынцып вяршэнства закону і грамадзянскія свабоды.



## СУДОВА-ПРАВАВАЯ БАЗА Ў БЕЛАРУСІ

### Адсутнасць незалежнай судовай сістэмы

Судовая сістэма Беларусі характарызуецца адсутнасцю незалежнасці і ў значнай ступені кантралюецца непасрэдна дэ-факта прэзідэнтам Лукашэнкам. Яшчэ да змен у Канстытуцыі ў 2022 годзе, кіраўнік дзяржавы прызначаў большасць суддзяў і здымаў іх з пасады з ініцыятывы старшынь судоў. Уплыў выканаўчай улады на судовую тут відавочны, паколькі старшыні судоў выбіраюцца дэ-факта прэзідэнтам.

У выніку гэтага нацыянальныя суды сталі часткай рэпрэсіўнай машыны і сістэматычна выносяць выракі дысідэнтам па палітычных матывах у парушэнне шматлікіх гарантый справядлівага судовага разбору. У выніку жорсткіх рэпрэсій супраць адвакатаў, якія адстойваюць інтарэсы абвінавачаных па палітычных матывах, практычна ніхто з іх не адважваецца брацца за падобныя справы, што сур'ёзна абмяжоўвае права на справядлівы суд, выкананне працэсуальных норм і доступ да сродкаў прававой абароны ў Беларусі.



### Татальны дзяржаўны кантроль над адвакатурай

Напрыканцы 2021 года ў Рэспубліцы Беларусь была праведзена рэформа адвакатуры і адвакацкай дзейнасці, якая прывяла да сур’ёзных зменаў, што ўзмацнілі залежнасць прафесіі ад дзяржаўных структур і кантроль над ёй.

Беларускія ўлады кантралююць прафесію адваката і падрываюць яе незалежнасць. Адвакацкія калегіі сталі інструментам рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі і ажыццяўлення рэпрэсій. Міністэрства юстыцыі мае поўны кантроль над адвакатурай, паколькі яно цесна звязана з дзяржавай і сістэматычна падтрымлівае палітыку ўрада. Яно ўпаўнаважана звальняць адвакатаў і распускаць іх асацыяцыі пад ілжывымі падставамі.

- Адвакатура актыўна падтрымлівае выбары, санкцыянаваныя ўрадам, і тым самым спрыяе стварэнню іміджу адвакатаў як адэптаў дзяржаўнай палітыкі.
- Адвакаты пазбаўлены права працаваць як прыватныя асобы ці адкрываць прыватныя практыкі, але абавязаны ўваходзіць у бюро юрыдычных кансультацый, якія створаны пад кантролем рэгіянальных калегій адвакатаў у каардынацыі з Міністэрствам юстыцыі.
- Знізілася ўпэўненасць грамадства ў незалежнасці адвакатаў, у выніку чаго грамадзяне страцілі веру ў іх як у абаронцаў правоў асобы.
- Насельніцтва не жадае патрабаваць правасуддзя ў справах, звязаных з выбарамі, у сувязі з магчымым прадузятым стаўленнем адвакатаў да ўрада.
- Доступ да адвакацкай дзейнасці абмежаваны, адбор адвакатаў ажыццяўляецца на аснове лаяльнасці праз здачу кваліфікацыйных экзаменаў пад кантролем міністэрства, што пазбаўляе іх магчымасці выказваць незалежнае меркаванне.
- Прынцыпы дэмакратыі і абароны правоў чалавека аслаблены, паколькі грамадзяне пазбаўлены доступу да непрадузятай юрыдычнай абароны.

# АДВАКАЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ

## ПЕРАШКОДЫ, ЯКІЯ ЎЗНІКАЮЦЬ ПРЫ АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ АДВАКАЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ПАЛІТЫЧНА МАТЫВАВАНЫХ СПРАВАХ

### Адсутнасць празрыстасці:

З 2020 года следчыя ўсё часцей патрабуюць ад адвакатаў падпіску аб неразгалошванні інфармацыі па палітычна матываваных крымінальных справах. Той факт, што распаўсюджанне інфармацыі без дазволу можа быць кваліфікавана як крымінальнае злачынства, застрашвае адвакатаў, якія публічна асуджаюць самавольства. Акрамя таго, у падобных справах судовыя пасяджанні вельмі часта адбываюцца за зачыненымі дзвярыма, што стварае больш спрыяльную глебу для парушэння правоў чалавека.

### Парушэнне прынцыпу справядлівага судовага працэсу:

Адвакаты, якія вядуць палітычна матываваныя справы, заяўляюць, што адчуваюць сябе абеззброенымі і няздольнымі забяспечыць эфектыўную абарону сваіх кліентаў з-за пастаяннага парушэння працэсуальных нормаў. Прынцып «роўнасці бакоў» не выконваецца часта шляхам адмаўлення ў доступе да ўсіх матэрыялаў справы, абмежавання доступу адвакатаў да сваіх кліентаў і парушэння канфідэнцыяльнага характару іх кантактаў.



## ПЕРАСЛЕД АДВАКАТАЎ

Упершыню ў гісторыі Беларусі адвакаты самі сталі палітзняволенымі з-за працы ў інтарэсах сваіх кліентаў.

Рэпрэсіі ў адносінах да адвакатаў у Беларусі ўзмацніліся пасля выбараў у 2020 годзе. Тыя, хто абараняе палітычных апазіцыянераў або крытыкуе дзеянні ўрада, сістэматычна пераследуюцца або затрымліваюцца. Адміністратыўныя ці крымінальныя санкцыі амаль непазбежна вядуць да выключэння з прафесіі і ствараюць атмасферу пастаяннага страху. Такая сітуацыя яшчэ больш аслабляе прынцып вяршэнства закону і робіць справядлівае правасуддзе для грамадзян немагчымым.

## ФОРМЫ РЭПРЭСІЙ

Адвакаты трапляюць под розныя формы рэпрэсій, найбольш распаўсюджанымі з якіх з'яўляюцца пазбаўленне ліцэнзіі, арышты па адміністратыўных і крымінальных справах, пераслед і публічная дыскрэдытацыя. Некаторыя з іх апынаюцца за кратамі, атрымліваюць выракі пад час несправядлівых судовых працэсаў ці нават гвалтоўна знікаюць — усё гэта робіцца, каб прымусіць іх маўчаць і перашкодзіць абароне правоў чалавека.

## ДАДЗЕНЫЯ ЗА 2020-

- Не меньш за 11 адвакатаў прыцягнуты да адказнасці за выконванне сваіх прафесійных абавязкаў.
- 6 адвакатаў сёння знаходзяцца ў турмах — адзін з іх утрымліваецца ў рэжыме інкамунікада.
- 4 адвакаты перажылі катаванні падчас затрымання і допытаў.
- Не меньш за 3 адвакатаў былі вымушаны запісаць так званыя «прызнальныя відэа», у якіх іх прымушалі прызнацца ў супрацьпраўных дзеяннях.
- Не меньш за 139 адвакатаў пазбаўлены права на прафесію на падставе:

- дзеянняў, якія супярэчаць статусу адваката;
- вынікаў атэстацыі/пераатэстацыі, праведзенай кваліфікацыйнай камісіяй пад эгідай Міністэрства юстыцыі;
- рашэння Дысцыплінарнай камісіі тэрытарыяльнай калегіі адвакатаў




**З пачатку 2024 года ўлады і тэрытарыяльныя калегіі адвакатаў прыпынілі паведамляць пра пазбаўленне адвакатаў ліцэнзій.**

## НАСТУПСТВЫ ДЛЯ АДВАКАТАЎ: ВЫГНАННЕ ЯК СПОСАБ ВЫЖЫЦЬ

Жорсткія рэпрэсіі супраць адвакатаў прывялі да іх масавай эміграцыі каб пазбегнуць арышту. Пераслед Беларускіх адвакатаў, якім удалося ўцячы з краіны, не спыняецца:

- яны атрымліваюць пагрозы ў адрас членаў сваіх сямей;
- распачынаюцца крымінальныя справы супраць іх і арыштоўваецца маёмасць, якая знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі;
- працягваецца крымінальны пераслед адвакатаў завочна па палітычна матываваных справах («спецыяльная вытворчасць»);
- яны пазбаўляюцца грамадзянства праз абвінавачванне ў палітычным злачынстве.

## КАТАВАННІ І ЖОРСТКАЕ АБЫХОДЖАННЕ Ў МЕСЦАХ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ

Па словах сведак, супрацоўнікі праваахоўных органаў таксама ўжываюць катаванні падчас арыштаў, затрыманняў і допытаў. Згодна з паведамленнямі, адвакатаў таксама б'юць, труцяць газам, надзяваюць на іх наручнікі. Ім пагражаюць, у тым ліку сексуальным гвалтам.

Адвакаты, асуджаныя на адміністратыўны арышт, паводле існуючых даных, зазнавалі у следчых ізалятарах розныя формы бесчалавечнага абыходжання, якое зневажае годнасць. Інфармацыі пра умовы, у якіх адбываюць пакаранне адвакаты, асуджаныя па крымінальных справах, увогуле няма.

**Пасля 2020 года ніводны выпадак жорсткага абыходжання ці катаванняў з боку міліцыі не быў разгледжаны ў судзе, у выніку чаго падобныя парушэнні правоў чалавека застаюцца фактычна беспакаранымі.**

## Наталля Мацкевіч



Наталля працавала адвакаткай у Мінску з 1994 па 2021 год. Яе кар'ера супала са станаўленнем незалежнасці Беларусі як паслясавецкай дзяржавы, якая з цягам часу перайшла да аўтарытарнага рэжыму Аляксандра Лукашэнка.

*«Я абараняла правы чалавека ў нацыянальных судах і органах Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, займалася пытаннямі міграцыі. Я вяла справы, звязаныя з палітычнымі дзеячамі, праваабаронцамі, актывістамі і журналістамі.*

*У 2020–2021 гадах, падчас палітычнага і прававога крызісу ў Беларусі, звязанага з прэзідэнцкімі выбарамі 2020 года, я абараняла інтарэсы галоўных палітычных апанентаў Лукашэнкі – Сяргея Ціханоўскага і Віктара Бабарыкі, за што была пазбаўлена ліцэнзіі ў кастрычніку 2021 года.*

*Мне часта даводзілася сутыкацца з парушэннямі прафесіянальных гарантый і працэсуальных правоў. У некаторых выпадках мне адмаўлялі ў праве наведваць кліентаў у месцах пазбаўлення волі. У красавіку 2021 года мая канфідэнцыяльная размова з Сяргеем Ціханоўскім у СІЗА была паказана ў эфіры дзяржаўнага тэлебачання. У кастрычніку 2021 года, падчас судовага працэсу над Ціханоўскім, які праходзіў за зачыненымі дзвярыма ў турме, я была адхілена ад адвакацкай практыкі. А пасля гэтага я была і ўвогуле пазбаўлена права займацца адвакацкай дзейнасцю ў Беларусі, але працягвала абараняць сваіх кліентаў у органах ААН.*

*Пасля таго як мяне выклікалі на допыт наконт маіх сувязей з праваабарончымі арганізацыямі, мы з сям'ёй былі вымушаны выехаць з Беларусі ў Грузію (каб не перасякаць граніцу Эўразвязу), а потым у Літву.*

*У цяперашні час я працую экспертам у праграмах нефармальнай адукацыі па правах чалавека для адвакатаў і праваабаронцаў, а таксама ўдзельнічаю ў праектах, накіраваных на распрацоўку заканадаўчай рэформы для будучай Беларусі. Я працягваю прадстаўляць інтарэсы сваіх кліентаў у міжнародных органах і ў грамадскай сферы».*

## Андрэй Атаманчук



Андрэй Атаманчук працуе ў юрыспрудэнцыі з 1998 года. У 2018 годзе ён атрымаў статус адваката і ўдзельнічаў у якасці абаронцы ў палітычна матываваных крымінальных і адміністратыўных справах, у тым ліку ў абароне асоб, прызнаных міжнароднай супольнасцю палітычнымі вязнямі.

«Раніцай 31 сакавіка 2022 года супрацоўнікі КДБ уварваліся ў мой дом і правяліператрус. Мяне абвінавацілі ў здзяйсненні неіснуючых злачынстваў, пасля чаго адправілі ў турму на 30 дзён.

Кіраўніцтва Мінскай калегіі адвакатаў не аказала мне аніякай дапамогі, а наадварот, зрабіла ўсё магчымае, каб хутчэй пазбавіць мяне права займацца прафесіянальнай дзейнасцю. Як кажуць супрацоўнікі КДБ, калегія адвакатаў прымае непасрэдны ўдзел у пераследзе непажаданых адвакатаў. (...)

Я быў вымушаны пакінуць Беларусь разам з сям'ёй і пераехаць у Літву, дзе мы атрымалі сталы дазвол на жыхарства. Нам прапанавалі бясплатныя курсы літоўскай мовы і стварылі ўсе ўмовы для інтэграцыі ў літоўскае грамадства».

## МІЖНАРОДНАЯ АБСЕРВАТОРЫЯ ДЛЯ АДВАКАТАЎ У НЕБЯСПЕЦЫ

Міжнародная абсерваторыя для адвакатаў у небяспецы (OIAD) – гэта ініцыятыва Нацыянальнай рады адвакатаў Францыі (Conseil National des Barreaux), Парыжскай калегіі адвакатаў (Barreau de Paris), Генеральнай рады гішпанскай адвакатуры (Consejo General de la Abogacía Española) і Нацыянальнай рады адвакатаў Італіі (Consiglio Nazionale Forense).

Наша арганізацыя, створаная ў 2016 годзе, ставіць на мэту абарону адвакатаў, якія сутыкаюцца з пагрозамі пры ажыццяўленні сваіх прафесійных абавязкаў, і змаганне з сітуацыямі, у якіх парушаецца права на абарону.

Мы хочам стаць адным з эфектыўных механізмаў для абароны адвакатаў і змагароў за правы чалавека, і цесна супрацоўнічаць з тымі інструментамі, што ўжо існуюць.

Абсерваторыя аб’ядноўвае значную колькасць адвакацкіх калегій і арганізацый і імкнецца стаць ключавым міжнародным гульцом у галіне абароны адвакатаў у небяспецы.

## БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ АДВАКАТАЎ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

З моманту свайго стварэння ў красавіку 2023 года Беларуская асацыяцыя адвакатаў правоў чалавека займаецца абаронай адвакатаў, якіх пераследуюць за ўдзел у справах, што маюць палітычны рэзананс.

Асацыяцыя аб’ядноўвае дасведчаных юрыстаў і прадстаўляе інтарэсы адвакатаў, якія былі незаконна пазбаўлены права на прафесію або прыцягнуты да адказнасці за сваю працу. Гэтыя адвакаты часта ўдзельнічалі ў гучных справах, напрыклад, у абароне Марыі Калеснікавай і Сяргея Ціханоўскага.

Асацыяцыя прадстаўляе інтарэсы адвакатаў, у адрас якіх паступаюць пагрозы з боку беларускіх уладаў. Яна супрацоўнічае з міжнароднымі юрыдычнымі арганізацыямі, каб прыцягнуць увагу да рэпрэсій у дачыненні да беларускіх адвакатаў і палепшыць прававую падтрымку.